## ВІЦЕБСКА-АРШАНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ
## (23–28 ЧЭРВЕНЯ 1944)

**Віцебска-аршанская аперацыя (1944),** наступальная аперацыя войск 1-га Прыбалтыйскага (генерал арміі І. Х. *Баграмян)* і 3-га Беларускага (генерал-палкоўнік, з 26.06.1944 генерал арміі І. Д. *Чарняхоўскі)* франтоў 23–28 чэрвеня, састаўная частка *Беларускай аперацыі (1944).* Мэта – разгром левага крыла (3-я танкавая і 4-я палявая арміі) нямецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр» (генерал-фельдмаршал Э. Буш).

Удзельнічалі арміі: 6-я гв. (генерал-лейтэнант І. М. *Чысцякоў),* 43-я (генерал-лейтэнант А. П. *Белабародаў),* 39-я (генерал-лейтэнант І. І. Люднікаў), 5-я (генерал-лейтэнант М. І. *Крылоў),* 11-я гвардз. (генерал-лейтэнант К. М. Галіцкі), 31-я (генерал-лейтэнант В. В. Глаголеў), 5-я гвардз. танк. (маршал бранятанкавых войск П. А. *Ротмістраў),* 1-ы танкавы корпус (генерал-лейтэнант В. В. Буткоў). Дзеянні сухапутных войск падтрымлівалі 3-я (генерал-лейтэнант М. П. *Папівін)* і 1-я (генерал-лейтэнант М. М. *Громаў)* паветраныя арміі. Каардынаваў дзеянні франтоў Маршал Савецкага Саюза А. М. *Васілеўскі.* Войскам ставілася задача разграміць групоўкі праціўніка: віцебска-лепельскую і авалодаць раёнам Лепель – Чашнікі; віцебскую і вызваліць Віцебск; аршанскую, вызваліць Оршу і выйсці да р. Бярэзіна.

Нямецкае камандаванне надавала выключнае значэнне абароне Віцебска-Аршанскага раёна. Тут быў створаны магутны абарончы рубеж глыбінёю 20–45 км пад умоўнай назвай «Пантэра» (частка *«Усходняга вала»)* з выкарыстаннем умоў лясіста-балоцістай мясцовасці і шматлікіх рэк з шырокімі забалочанымі поймамі, у вузлы абароны былі ператвораны Віцебск, Орша, іншыя населеныя пункты. Напярэдадні наступлення галоўных сіл франтоў 22 чэрвеня праведзена разведка боем, у ноч на 23 чэрвеня – папярэдняя авіяцыйная падрыхтоўка.

Раніцай 23 чэрвеня пасля артылерыйскай падрыхтоўкі пачалося наступленне. Войскі 6-й гвардз. і 43-й армій 1-га Прыбалтыйскага фронту прарвалі абарону праціўніка на ПнЗ ад Віцебска, 23 чэрвеня вызвалілі Шуміліна, 24 чэрвеня каля Бешанковіч фарсіравалі Заходнюю Дзвіну, стварылі на левым яе беразе некалькі плацдармаў і, расшыраючы іх, 25 чэрвеня вызвалілі Бешанковічы. Войскі 39-й і 5-й армій 3-га Беларускага фронту прарвалі абарону на ПдУ ад Віцебска. У ноч на 25 чэрвеня войскі сумежных 43-й і 39-й армій злучыліся каля в. Гняздзілавічы (цяпер Гняздзілава), утварыўся так званы віцебскі «кацёл», у які трапіла 5 дывізій 3-й нямецкай танкавай арміі; да 27 чэрвеня яны былі разгромлены. 26 чэрвеня вызвалены Віцебск.

Адначасова войскі левага крыла 3-га Беларускага фронту – 11-я гвардзейская і 31-я арміі – пераадольвалі ўпартае супраціўленне ворага на аршанскім напрамку, у ходзе наступлення 26 чэрвеня вызвалілі Дуброўна. У паласе дзеянняў 5-й арміі ў прарыў фронту праціўніка былі ўведзены конна-механізаваная група (генерал-лейтэнант М. С. *Аслікоўскі)* у раёне Багушэўска (25 чэрвеня вызвалены Багушэўск і Сянно) і 5-я гвардзейская танкавая армія, у раёне в. Клюкаўка – 2-і гвардзейскі танкавы корпус (генерал-маёр А. С. *Бурдзейны).* 26 чэрвеня 5-я гвардзейская танкавая армія і 2-і гвардзейскі танкавы корпус перарэзалі чыгунку і шашу Масква – Мінск у раёне Пагост – Талачын (26 чэрв. вызвалены Талачын), чым стварылі пагрозу акружэння аршанскай групоўкі праціўніка. 27 чэрвеня 11-я гвардзейская і 31-я арміі вызвалілі Оршу.

Працягваючы наступленне, савецкія войскі 27 чэрвеня вызвалілі Чашнікі. Да 28 чэрвеня войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту выйшлі на рубеж за 30 км на ПдУ ад Полацка – Лепеля

(28 чэрвеня вызвалілі Лепель). Войскі 3-га Беларускага фронту выйшлі да р. Бярэзіна на Пн ад Барысава. У выніку аперацыі савецкія войскі прасунуліся на 80–150 км, стварылі ўмовы для паспяховага наступлення ў напрамках на Мінск і на тэрыторыю Прыбалтыкі. У аперацыі ўдзельнічалі партызанскія брыгады 2-я імя К. С. Заслонава, 1-я Смаленская і інш. 62 злучэнням і часцям, якія вызначыліся ў аперацыі, прысвоены ганаровыя найменні «Віцебскіх», 41 – «Аршанскіх».

*У. І. Вышынскі.*

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Беларусь** у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 126–127.